**В. А. Буднік**
Брэст, Брэсцкі дзяржаўны тэхнічны ўніверсітэт

# КАНЦЭПТУАЛЬНАСЦЬ І ТЫПАЛОГІЯ ЖАНОЧЫХ ВОБРАЗАЎ У РАМАНЕ І. ПТАШНІКАВА “АЛІМПІЯДА” І В. РАСПУЦІНА “РАЗВІТАННЕ З МАЦЁРАЙ”

Шматаблічны вобраз жанчыны ў сусветным мастацтве прадстаўлены ў розных іпастасях: маці, каханая, мадонна, захавальніца сям’і, родавай памяці, пакутніца, міратворац. Вобраз-архетып жанчыны заснаваны на глыбокім гісторыка-канцэптуальным асэнсаванні быцця, гэта актуальны культурны код у мастацтве розных эпох. Жаночыя вобразы-канцэпты, розныя варыянты архетыпу, прысутнічалі ў літаратуры ад пачатку яе існавання. Яны ўніверсальныя ў культуры розных краін, але адрозніваюцца прыватнымі характарыстыкамі. Разам з тым асноўнае значэнне гэтага канцэпту выводзіць у сферу анталогіі, застаецца канстантным і вызначаецца пераважна сямейнай роляй гераіні.

Вобраз жанчыны-маці на працягу стагоддзяў натхняў таленавітых аўтараў, бо гэта вечная і невычарпальная тэма. У якасці прыкладу з мастацкай літаратуры згадваюцца вобразы Беатрычэ з “Боскай камедыі” Дантэ Аліг’еры як увасабленне чыстай жаноцкасці, Таццяны Ларынай з рамана А. Пушкіна “Яўген Анегін”, які сімвалізуе рускую душу і ідэальны жаночы пачатак, Чорнай Дамы і Незнаёмкі ў вершах А. Блока як увасабленне жаноцкасці. У беларускай літаратуры вобраз-канцэпт жанчыны выразна выяўляецца ўжо ў літаратуры XIX ст. і мае ўніверсальную ёмістасць: працаўніца і змагарка, Плачка-Беларусь (Я. Баршчэўскі); каханая, сяброўка-Беларусь (Марыська чарнаброва К. Каліноўскага); маці, ахоўніца сям’і, роднай зямлі, змагарка за волю (Янка Купала);

каханая дзяўчына, мадонна, маці, якая самаахвярна дарыць жыццё (М. Багдановіч). У беларускай духоўна-мастацкай прасторы другой паловы XX ст. вобраз жанчыны-маці – адзін з самых ёмістых. Ён аб'ядноўвае тыпалагічныя рысы пяшчотнай і нястомнай матулі-працаўніцы, жанчыны-патрыёткі, на долю якой выпала змаганне супраць фашыстаў за волю роднай зямлі, за захаванне дзяцей і сям'і ў суровы час акупацыі.

У беларускай літаратуры ў драматычнай велічы прадстаўлены высокамастацкія вобразы трывушчых жанчын-удоў, салдатак, чые мужы, гаспадары, каханыя загінулі на вайне ці былі рэпрэсаваны яшчэ ў даваенны час. Працай, каханнем, самаахвярнасцю беларускіх жанчын неаднойчы ў гісторыі адраджалася жыццё на нашай зямлі. І як гэта часта бывае, жанчына-працаўніца бярэ на сябе адказнасць выратавання іншых. Вобраз і лёс беларускай жанчыны знаходзяць шматаспектнае ўвасабленне ў нашай літаратуры.

Адметнае месца ў шэрагу выдатных твораў нацыянальнай прозы, дзе створаны высокамастацкі вобраз маці-працаўніцы і ахавальніцы жыцця, займае раман І. Пташнікава "Алімпіяда" (1984). Пісьменнік рэалістычна, псіхалагічна дакладна ўзнаўляе напружанае, бязмерна цяжкае жыццё беларускай калгаснай вёскі 60-х гг. XX ст. і стварае шэраг пераканаўчых жаночых вобразаў-тыпаў. Галоўная гераіня рамана – калгасніца, сялянка *Алімпіяда Падаляк.* Менавіта гэты вобраз арганізуе ўсю вобразную сістэму ў творы, у ім у вялікай ступені выяўлены адносіны аўтара да жыцця, да навакольнага свету.

Пры стварэнні вобраза галоўнай гераіні, жанчыны-маці, І. Пташнікаў абапіраўся на аўтабіяграфічны вопыт. Вядома, што ў рамане "Алімпіяда" пісьменнік увасобіў лёс роднай маці, якой у той час ужо не было. На сустрэчах з чытачамі І. Пташнікаў успамінаў, як у красавіку 1943 г. маці на тры дні знікла з дому, бо даведалася, што ў далёкай вёсцы, больш за трыццаць кіламетраў ад роднага Задроздзя, гінуць каровы. Яна, юная жанчына, прайшла семдзесят кіламетраў, каб здабыць сваім дзецям карову. Два дні крок за крокам, упрошваючы, падштурхоўваючы, плачучы, праклінаючы і спадзеючыся, вяла яна карміцельку дадому. Дасягнуўшы мэты, дайшоўшы да пагорка роднай вёскі, маці і карова знясілена ўпалі пад красавіцкім сонцам. Гэтыя ўспаміны пісьменніка аб трывучасці роднай матулі выяўляюць яго творчую пазіцыю. Аўтар прызнаваўся, што прататыпам галоўнай гераіні стала яго маці. У асаблівай увазе І. Пташнікава да жанчыны-працаўніцы, сціплай, спакойнай, цярплівай, чулай, бачыцца сцвярджэнне жыццятворнага пачатку лёсу беларускі.

Рэцыпіент разам з аўтарам захапляюцца галоўнай гераіняй рамана "Алімпіяда". Асноўныя сюжэтныя падзеі твора адбываюцца ў першыя пасляваенныя дзесяцігоддзі. Аднак вайна ўсё яшчэ жыве ў памяці і свядомасці герояў, жыхароў старэйшага пакалення, беларускіх вяскоўцаў. Сталенне галоўнай гераіні Алімпіяды адбывалася ў драматычны ваенны і пасляваенны час. Яна згадвае кароткае шчасце сямейнага жыцця, нараджэнне сына Міфодзі і дачкі Тані, заўчасную смерць мужа Мікалая. Усё жыццё Улімы – цяжкая, непасільная праца ў калгасе, на ферме. У асноўнай сюжэтнай лініі І. Пташнікаў адлюстроўвае якраз той перыяд жыцця гераіні, калі яна, ужо немаладая, спрацаваная за жыццё, адчула, што "дажывае". Алімпіяда вельмі часта ў думках

звяртаецца да мінулага. Праз увесь раман рэтраспектыўным планам праходзіць жыццё гераіні. Ствараючы вобраз Алімпіяды, аўтар засяроджваецца на самым важным, галоўным, тым, што вызначае мэту і сэнс існавання чалавека на свеце. Даваеннае жыццё паказана сцісла, ваеннае ліхалецце – праз нешматлікія, але памятныя драматычныя эпізоды, праз спробы ўратаваць параненых чырвонаармейцаў. Для разумення характару гераіні важнае значэнне маюць эпізоды ваенных падзей. Алімпіяда і яе муж Мікалай ратуюць двух параненых лётчыкаў. Яны нават думкі не дапускаюць, што можна пакінуць байцоў без дапамогі. Для Алімпіяды бездапаможныя байцы – нібы яе дзеці. Схаваўшы іх у лесе і потым робячы ім перавязкі, гераіня зусім не думала пра сябе. Яна без ваганняў, спакойна і прывычна ўзялася выходжваць чырвонаармейцаў. Калі смяртэльная небяспека навісла над гераіняй, яна адкідвае ўсялякую дыпламатыю, спакойна і смела глядзіць у вочы здрадніку Кукаеву. Нягледзячы на пагрозу сваёй сям'і, Алімпіяда рызыкуе і застаецца чалавекам – чулым, спагадлівым і сумленным.

У сістэме жаночых вобразаў рамана Алімпіяда ўяўляе сабою выключэнне. Вобразы іншых гераінь – Сцяпанаўны, Марфы, Гілены Чайкі – пададзены таксама ў складанасці і драматызме лёсаў, часам з аўтарскім падкрэсліваннем асобных супярэчлівых момантаў у іх паводзінах і выказваннях. Алімпіяда ж цалкам пазбаўлена аўтарскай крытыкі, яна заўважана ідэалізуецца пісьменнікам. У абліччы гэтай гераіні ў асабліва сканцэнтраваным выглядзе сабраны лепшыя маральныя і духоўныя якасці, уласцівыя беларускаму жаночаму характару. На прыкладзе Алімпіяды аўтар стварыў вобраз самаахвярнай жанчыны, маці, працаўніцы, абмалёўваючы яе ў паўсядзённай нястомнасці, у сямейных адносінах, сапраўднай духоўнай годнасці і маральнай прывабнасці. Аўтар акцэнтуе ўвагу на духоўным свеце гераіні, яе прыроджанай душэўнай мудрасці.

У рускай літаратуры таксама багата твораў, дзе вобраз-канцэпт жанчыны мае цэнтральнае значэнне. Так, падобныя рысы з пташнікаўскай Алімпіядай знаходзім у аднаго з яскравых прадстаўнікоў рускай вясковай прозы другой паловы XX ст. В. Распуціна. Гэта творчая характарыстыка звязана з тым, што аповесцю "Развітанне з Мацёрай" (1976) сібірскі пісьменнік увёў у тагачасную прозу праблемы экалогіі, захавання традыцыйнага ўкладу жыцця, сцвярджаў ідэі гуманнага стаўлення да чалавека. В. Распуцін актуалізаваў архетып роднага, маральнасць і эстэтыку народных традыцый, якія пачалі ў 70-я гг. XX ст. забывацца. Сам жа пісьменнік лічыў падзел прозы на вясковую, гарадскую, ваенную і г. д. вельмі ўмоўным. Як адзначаў В. Распуцін, яго канчатковая мэта – паказаць адносіны чалавека перш за ўсё з самім сабой.

Героі большасці твораў В. Распуціна – звычайныя вяскоўцы, якія працуюць на полі, кахаюць, п'юць гарбату. Але іх хвалююць важныя і вострыя праблемы быцця і гуманізму. І для пісьменніка В. Распуціна было важна, каб грамадства пачула запавет яго герояў: яны не супраць цывілізацыі, не пярэчаць ёй, але просяць, каб тэхнічны прагрэс не знішчаў чалавечнасць, спрадвечныя маральныя асновы жыцця народа. В. Распуцін, як і І. Пташнікаў, нарадзіўся і вырас у вёсцы. Пішучы пра выміранне вёсак, рускі пісьменнік адчуў вялікую трывогу: са знікненнем вёсак страчваліся важныя для светаадчування кожнага чалавека пачуцці радзімы, родавай памяці. Калі пачалося будаўніцтва ГЭС на

Ангары і сталі знішчацца маленькія вёсачкі і старыя пасяленні, пісьменнік напісаў аповесць "Развітанне з Мацёрай" – твор аб балючай і трывожнай памяці народа, аб драматычным сутыкненні новага з вечным. Твор прынёс шырокую вядомасць аўтару. У цэнтры любога наратыву знаходзіцца пэўная гісторыя. У дадзеным выпадку гэта Мацёра – невялікая вёска, якая ў хуткім часе павінна быць затоплена і стане дном вялізнага штучнага вадаёма. Жыхарам пра гэта добра вядома, але пакуль яшчэ ўсё ідзе па-старому. Героі аповесці яшчэ спадзяюцца: раптам планы "зверху" зменяцца, і ўсё застанецца па-ранейшаму і яны будуць жыць на сваёй зямлі, якая засталася ім ад продкаў. Наступае драматычны пералом у свядомасці старажылаў: яны даведаліся, што чужыя людзі руйнуюць вясковыя могілкі, на якіх пахаваны іх родныя дзяды і прадзеды. Жыхарам становіцца ясна, што сталася сапраўднае дзікунства і што нічога змяніць і выправіць ужо нельга.

Адбываецца злом у свядомасці ў маральных уяўленнях кожнага жыхара Мацёры. Моладзь рада пакінуць глухую вёску, хлопцам і дзяўчатам хочацца новага, гарадскога жыцця. Маладзейшыя вяскоўцы з задавальненнем паляць родныя хаты, абы хутчэй перабрацца ў зручныя гарадскія кватэры. Старыя ж па-іншаму ставяцца да такога пералому. Для іх тут усё сваё, роднае. На могілках спачываюць блізкія ім людзі. Старыя адчуваюць сябе здраднікамі ў адносінах да нябожчыкаў, вiняць сябе, што не здолелі захаваць апошняе месца спачынку сваіх продкаў, лічаць гэта сапраўдным здзекам і кідаюцца абараняць месца вечнага спачыну. Цэнтральнае месца ў аповесці "Развітанне з Мацёрай" належыць жанчыне *Дар'і Васільеўне*. Гераіня – карэнная жыхарка вёскі, якая правяла тут больш за восем дзясяткаў гадоў. Яе знешнасць адпавядае цвёрдасці характару: Дар'я высокая і худая, са строгім бяскроўным тварам. Нягледзячы на ўзрост, гераіня застаецца энергічнай, сама спраўляецца з працай па гаспадарцы, а яна ў яе немаленькая. Шмат дыскусій выклікаў гэты твор В. Распуціна і асабліва вобраз галоўнай гераіні. У прыватнасці, венгерскі крытык Ласла Ягусцін слушна адзначаў, што носьбітам духоўнага вопыту ў творах прадстаўнікоў вясковай прозы з'яўляюцца жанчыны. Яны прытрымліваюцца патрыярхальных запаведзяў, "сваёй ціхай самаадданасцю, уменнем ахвяраваць сабой, узнімаюцца да ўзроўню маральнага подзвігу і становяцца прыкладам для пераймання" [3, с. 100]. Дар'я, як і пташнікаўская Алімпіяда, мудрая і разважлівая, здаецца, нічога ёй не страшна. Крыніца такой смеласці – трывалы народны маральны вопыт, набыты за нялёгкае жыццё. Дар'я Пінігіна трыццаць гадоў таму засталася ўдавой. Яе муж без вестак знік у тайзе. Жанчына перажыла і смерць траіх дзяцей. Яшчэ трое даўно выраслі і жывуць самастойна. Тым не менш хата гераіні не пустуе: тут збіраюцца жыхары вёскі, каб папіць гарбату і пагаварыць. Жанчына мудра і аднолькава глыбока разважае і аб бягучых справах, і аб вечных праблемах. Аб усім яна мае сваё меркаванне. Яна перакапана: "Правда в памяти. У кого нет памяти, у того нет жизни" [2, с. 189].

Адметным прыёмам наратыўнай стратэгіі з'яўляецца асабліва падкрэсленая аўтарам значнасць пэўных эпізодаў. Напрыклад, шматзначны, сімвалічны эпізод, калі Дар'я перад ад'ездам з Мацёры назаўсёды прыбірае свой дом, як перад вялікім святам. Яна беліць сцены, чысціць і мые яго. Гэтым яна

паказвае сваю павагу і пашану дому, які ўсё жыццё быў яе абаронай, родным гняздом яе дзецям, тут яна пражыла сваё доўгае жыццё. Заўважаецца прыём наратыўнага злучэння галасоў аўтара і героя. Дзякуючы гэтаму апавядальная манера правакуе чытача на эмпатыю, гарачае суперажыванне. Старым людзям цяжка развітвацца з мінулым, бо яно не толькі іх уласнае, а звязана з лёсам продкаў і вечнай светлай памяццю пра іх. Па гэтай прычыне стары Ягор, які пераехаў у горад, страціў спакой і сон, бо здрадзіў вечнай сувязі з мінулым родных мясцін. Ён не вытрымаў – памёр у першыя тыдні пераезду.

Ва ўспрыманні жыцця В. Распуціна нямала збліжэнняў з І. Пташнікавым. Жыццё рускаму пісьменніку бачыцца і ў сваёй прыгажосці, і ў несумненнай суровасці. Нельга не згадзіцца з тым, што як руская, так і беларуская вясковая проза з яе маральнасцю, чалавечнасцю, болем і сумленнем не магла не з'явіцца ў гэты перыяд. На ўзнікненне такой вясковай прозы ўплываў і аб'ектыўны сацыяльна-грамадскі працэс. Векавы ўклад вёскі быў поўнасцю парушаны, разам з ім зруйнаваліся і многія яе маральныя асновы. А вёска ў славянскім свеце здаўна з'яўляецца захавальніцай маральна-этычных правіл народа. Гэта не магло не адлюстравацца ў літаратуры, якая заўсёды чуйна ўлаўлівае падобныя змены. Па-мастацку даследуючы супрацьпастаўленне горада і вёскі, абодва пісьменнікі вырашалі не вузкія праблемы, а пытанні агульначалавечай этыкі, важныя як для горада, так і для вёскі, як для старога, так і для маладога пакалення.

В. Распуціна ў аповесці "Развітанне з Мацёрай", як і І. Пташнікава ў рамане "Алімпіяда", хвалюе менавіта духоўна-маральны аспект сучаснага грамадства. Галоўную праблему быцця пісьменнікі разумеюць у філасофскай яе пастаноўцы: для чаго чалавек нарадзіўся і жыве на зямлі і што для яго значыць гэтая зямля?.. Названыя творы абодвух пісьменнікаў яднае перакананне ў тым, што жыццё вёскі, вясковых жыхароў – гэта духоўная глеба як рускай, так і беларускай нацыянальнай культуры і народнай маральнасці, народных, духоўных традыцый і ўяўленняў пра дабро і зло.

Магчыма, В. Распуцін больш ідэалізуе рускага вяскоўца, чалавека глыбінкі, асуджае сучасную цывілізацыю, горад і іх негатыўную ролю ў разбурэнні нацыянальных традыцый. І. Пташнікаў не акцэнтуе ўвагу на тым, што пераезд у горад, таксама як і тэхнічны прагрэс, прывядзе да глабальнага разбурэння вясковых народных традыцый.

Намі заўважана, што як рускі, так і беларускі пісьменнікі імкнуцца звярнуць увагу чытачоў на выказваннях, маналогах герояў-вяскоўцаў, у якіх многа народнай мудрасці, выяўленай у тым ліку ў прыказках і прымаўках. Мова Дар'і, як і Алімпіяды, сакавітая і непасрэдная, яна па-народнаму трапная, жывая. Абодва пісьменнікі выкарыстоўваюць прыёмы стылізацыі маўлення гераінь пад гутарковае. Яны настройваюць рэцыпіента на ўспрыняцце гераінь простымі вясковымі працаўніцамі, якія, аднак, з'яўляюцца носьбітамі маральнасці, грунтоўнасці народнага жыцця.

Несумненна, аповесць "Развітанне з Мацёрай" і раман "Алімпіяда" маюць падобную праблематыку. Пісьменнікаў хвалявалі пытанні вымірання вёскі, разрыву духоўнасці і сувязей пакаленняў, разбурэнне маральнасці, сямейных адносін. Аднак у аповесці "Развітанне з Мацёрай" В. Распуцін закранае тэму

вёскі больш абвострана і трагічна, паказваючы драму непазбежнасці поўнага вынішчэння вёскі. Паглыбленне маральнай праблематыкі пісьменнік паказвае праз паводзіны людзей у складанай сітуацыі: хто застаецца чалавекам, а хто ператвараецца ў "Пятруху", чалавека, які дзеля атрымання грошай, спальвае свой дом, кінуўшы маці на суседзяў. У кампазіцыйнай структуры аповесці В. Распуціна і рамана І. Пташнікава таксама назіраецца тыпалагічнае падабенства – важную функцыю выконваюць дыялогі, унутраныя маналогі і ўспаміны герояў.

Закранаючы праблемы ўзаемасувязі пакаленняў, чалавечага сумлення, вечнага пошуку сэнсу жыцця, абодва аўтары ўжываюць падобныя наратыўныя прыёмы: мастацка-сэнсавае вылучэнне ключавых момантаў, эпізодаў, прыём рэтраспектывы, трапныя псіхалагічныя акцэнты на дэталях, глыбокая змястоўнасць сімвалічнай вобразнасці (у рамане І. Пташнікава "Алімпіяда"); ужыванне прыёмаў актывацыі чытацкай увагі, атаясамліванне наратара, пісьменніка і героя, што аказвае ўплыў на фарміраванне наратыўных інтанацый, на спалучэнне ў творы знешняй падзейнасці з унутранай (у аповесці В. Распуціна "Развітанне з Мацёрай").

Вобраз-канцэпт жанчыны ў беларускага і рускага пісьменнікаў выразна актуалізаваны пры ўвасабленні праблем нацыянальнага самаўсведамлення і грамадскай адказнасці сучасніка. Вобразы гераінь абодвух пісьменнікаў надзелены архетыпавымі рысамі: ахвярнасцю, зычлівасцю і бязмежнай любоўю да дзяцей і роднага краю, якія ў крытычнай сітуацыі ўзбуйняюцца да рашучасці, адвагі, бескампраміснай сумленнасці і самаахвярнасці.

**Спіс выкарыстанай літаратуры**


1. Пташікаў, І. Збор твораў : у 4 т. / І. Пташнікаў. – Мінск : Маст. літ., 1992. – Т. 4 : Раман. – 575 с.

2. Распутин, В. Последний срок. Прощание с Матёрой: Повести. Рассказ : для ст. шк. возраста / В. Распутин. – Минск : Юнацтва, 1990. – 383 с.

3. Сапа, А. Женские образы в творчестве В. Распутина / А. В. Сапа. – М. : Аналит. исслед., 2017. – 160 с.

4. Юнг, К. Душа и миф: шесть архетипов / К. Юнг. – ЗАО «Совершенство» – «Port Royal», 1997. – 384 с.